**М. А. Малянок,**
**кандыдат філасофскіх навук**

## Правы і свабоды чалавека ў Рэспубліцы Беларусь

Правы і свабоды асобы як вышэйшыя агульначалавечыя каштоўнасці, заваяваныя і ўсталяваныя кожным народам у працэсе яго развіцця, цесна ўзаемазвязаныя і ўяўляюць сабой адзіную сістэму. У іх адлюстроўваюцца магчымасці дзеянняў чалавека ў розных сферах грамадскага жыцця. І чым шырэй гэтыя правы, чым больш яны гарантаваны, тым свабаднейшая асоба.

Асноўныя правы і свабоды грамадзян нашай краіны замацаваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыя цалкам адпавядае міжнародна-прававым стандартам ў галіне правоў чалавека. Яна ўвасобіла поўны набор агульнапрызнаных правоў і свабод чалавека і прадугледзела неабходныя гарантыі іх рэалізацыі. Гэтыя правы і свабоды адпавядаюць Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, Міжнароднаму пакту аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Міжнароднаму пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах і іншым міжнародным актам аб правах чалавека.

Згодна з арт. 21 Асноўнага Закону забеспячэнне правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь з'яўляецца найвышэйшай мэтай дзяржавы. Прынцыпова важным палажэннем у галіне правоў чалавека Канстытуцыя прызнае роўнасць усіх перад законам і права кожнага без дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў (арт. 22).

Пералік правоў і свабод грамадзян змяшчае Раздзел II Канстытуцыі «Асоба, грамадства, дзяржава». У адпаведнасці са сферамі рэялізацыі правы і свабоды дзеляцца на грамадзянскія (асабістыя), палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя і культурныя.

Грамадзянскія (асабістыя) правы - гэта натуральныя, асноватворныя, неад'емныя правы чалавека, якія гарантуюць яго індывідуальную свабоду. Да ліку асабістых правоў і свабод грамадзян Асноўны Закон рэспублікі адносіць: права на жыццё, свабоду, недатыкальнасць асобы і жылля; права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў асабістае жыццё, у тым ліку ад замаху на яго гонар і годнасць;права на свабоднае перамяшчэнне і выбару месца жыхарства і іншыя.

Палітычныя правы і свабоды вызначаюць межы палітычнай дзейнасці грамадзян і формы іх удзелу ў кіраванні справамі грамадства і дзяржавы. Канстытуцыяй кожнаму грамадзяніну гарантуецца: свабода поглядаў, перакананняў і іх свабоднае выказванне; права на атрыманне і распаўсюджанне інфармацыі; свабода сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і пікетавання, якія не парушаюць правапарадак і правы іншых грамадзян; права на свабоду аб'яднанняў; выбарчае права і г. д.

Эканамічныя правы ўключаюць: права на абарону сваіх эканамічных інтарэсаў; права на справядлівую долю ўзнагароджання ў эканамічных выніках працы ў адпаведнасці з яе колькасцю, якасцю і грамадскім значэннем; права на ўласнасць і садзейнічанне яе набыццю; недатыкальнасць уласнасці і інш.

Сацыяльныя правы забяспечваюць кожнаму чалавеку годны ўзровень жыцця і сацыяльную абароненасць. Гэта права на працу і адпачынак, ахову здароўя, спрыяльнае навакольнае асяроддзе, сацыяльнае забеспячэнне, на жыллё і інш.

Культурныя правы, што гарантуюць духоўнае развіццё чалавека, уключаюць: права на адукацыю, права захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць; права карыстацца роднай мовай, выбіраць мову зносін; права на ўдзел у культурным жыцці; свабода мастацкай, навуковай, тэхнічнай творчасці.

Правы і свабоды, зафіксаваныя ў Канстітуцыі РБ, дастаткова поўна замацоўваюць прававы статус асобы. Але яны могуць быць рэалізаваныя толькі пры наяўнасці цэлага комплексу сацыяльных гарантый. Ва ўмовах жа сацыяльна-палітычнага крызісу, што ахапіў наша грамадства, дзяржава не можа забяспечыць поўнае і гарантаванае ажыццяўленне правоў чалавека.

У рэспубліцы назіраецца тэндэнцыя ігнаравання і парушэння правоў чалавека ў выніку выдаткаў нявопытнай дэмакратыі, прававога нігілізму, матэрыяльнай незабяспечаннасці і г. д. Пануючыя ў грамадстве беднасць і галеча - гэта парушэнне такога асноватворнага права асобы, як права на годнае існаванне. Не забяспечываецца ў краіне і права на працу. Ігнаруецца права свабоднага выбару месца жыхарства і інш.

У Рэспубліцы Беларусь ствараюцца новыя эканамічныя адносіны, ажыццяўляецца працэс станаўлення новых форм народаўладдзя, якія гарантуюць абарону правоў і свабод асобы. Важнейшай умовай забеспячэння правоў і свабод чалавека з'яўляецца ўсталяванне сацыяльнай прававой дзяржавы і